# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

19 снежня 2023 г. № 398 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За выдатныя дасягненні ў галіне тэатральнага, музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2023 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе Багдановіч Вольгі Тамашаўны, намесніка начальніка аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, Вярсоцкага Аляксандра Людвігавіча, старшыні Свіслацкага райвыканкама, Чыкавай Алены Анатольеўны, намесніка старшыні праўлення Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства, – за значны ўклад у рэалізацыю творчых праектаў па зберажэнні традыцыйнай культуры Беларусі, правядзенне каравай-фэсту ”Бацькава булка“;

Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству ”Беларускае тэлеграфнае агенцтва“, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь – за значны ўклад у захаванне гістарычнай памяці і праўды пра Вялікую Айчынную вайну і рэалізацыю праектаў ”Апошнія сведкі“, ”Генацыд. Без права на жыццё“;

заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь народнаму духавому аркестру ”Віціны“ дзяржаўнай установы адукацыі ”Стаўбцоўская дзіцячая школа мастацтваў“ – за значны ўклад у выхаванне творчай моладзі, актыўны ўдзел у грамадска-культурных праектах;

заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь узорнаму тэатру эстраднай песні ”Сябрынка“ філіяла адкрытага акцыянернага таварыства ”Мінскі аўтамабільны завод“ – кіруючая кампанія холдынга ”БЕЛАЎТАМАЗ“ ”Палац культуры МАЗ“ – за развіццё лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнага мастацтва, актыўны ўдзел у мерапрыемствах патрыятычнай тэматыкі;

Жыган Іване, актрысе, рэжысёру, грамадскаму дзеячу, і калектыву дзяржаўнай установы ”Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М.Горкага“ – за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю славянскай культуры, рэалізацыю сумесных беларуска-сербскіх творчых праектаў;

Лукашэнка Ганне Сяргееўне, паэту-песенніку, заснавальніку таварыства з абмежаванай адказнасцю ”МУЗЫЧНАЯ МЕДЫЯКАМПАНІЯ“, – за вялікі асабісты ўклад у развіццё сучаснага музычнага мастацтва, рэалізацыю сацыяльна значных культурных ініцыятыў;

Макарэвічу Руслану Алегавічу, індывідуальнаму прадпрымальніку, майстру народных музычных інструментаў, – за плённую працу па адраджэнні традыцый вытворчасці музычных інструментаў;

Масквіной Настассі Ігараўне, загадчыку трупы оперы дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы ”Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь“, народнай артыстцы Беларусі, – за высокае прафесійнае майстэрства, выдатныя дасягненні ў галіне музычна-тэатральнага мастацтва;

1-й і 2-й ротам ганаровай варты каменданцкага батальёна Мінскай ваеннай камендатуры, аркестру ганаровай варты Мінскай ваеннай камендатуры – за значныя дасягненні ў патрыятычным выхаванні моладзі, актыўны ўдзел у грамадска-палітычных і культурных мерапрыемствах;

Шунейка Алене Феліксаўне, метадысту дзяржаўнай установы культуры ”Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, – за плённую працу па захаванні традыцый вырабу габеленаў.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2023 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад падаходнага падатка з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь — А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 •
Для правовых актов

10